# ДАПАМАЖЫЦЕ НАШЫМ БІБЛІЯТЭКАМ!

## Да творчай інтэлігенцыі Беларусі

Шаноўнае спадарства! Нялёгкі час — час пераходу да рыначнай эканомікі — вымушае нас, прадстаўнікоў бібліятэчных работнікаў рэспублікі, звярнуцца да Вас з нашымі паўсядзённымі клопатамі, па дапамогу.

Справа ў тым, што нашы ўлады не прынялі дзейсных мер па сацыяльнай абароне бібліятэк, якія поўнасцю залежаць ад бюджэтнага фінансавання. Інфляцыя, нястрымнае павышэнне кошту жыцця, як вядома, прывялі да адпаведнага павышэння арэнднай платы, камунальных паслуг, будаўнічых работ, абсталявання і г. д.

Бібліятэкам не хапае сродкаў на набыццё заказанай літаратуры, яны могуць застацца без газет і часопісаў у сувязі з рэзкім падаражаннем падпіскі. Не стала грошай нават на камплектаванне нацыянальных фондаў бібліятэк, як таго патрабуе Закон аб мовах і ўзросшы інтарэс чытачоў да нацыянальнай культуры і гісторыі нашага народа.

Тым часам чытачы па-ранейшаму хочуць сустракацца з пісьменнікамі, мастакамі, музыкантамі, вучонымі. Але падчас такое запрашэнне каштуе для бібліятэкі не менш як 200 рублёў... Шкада, калі наша супрацоўніцтва стане толькі на фінансавай аснове.

Вось мы і просім Вас, па-ранейшаму працягваць нашу сумесную, цікавую і карысную як для чытача, так і для самога творцы, работу на грамадскіх пачатках. Няхай множыцца колькасць сустрэч у чытальных залах людзей мудрых, знакамітых з наведнікамі бібліятэк, асабліва дзіцячых, школьных. Няхай слова Ваша, жыццёвы вопыт дапамагаюць людзям у наш смутны час не зачарсцвець, не губляць сардэчнасць і павагу адзін да аднаго, да сваёй роднай зямлі, Бацькаўшчыны.

Ёсць яшчэ адно пажаданне. Вельмі хацелася б, каб нашы літаратары камплектавалі бібліятэчкі сваіх твораў і перадавалі свае кнігі з аўтографам бібліятэкам. Такім чынам мы пачнём карысную работу па стварэнню імянных фондаў у бібліятэках, палепшым іх дзейнасць па папулярызацыі нацыянальнай літаратуры.

У рэспубліцы дзейнічае многа творчых саюзаў, фондаў, іншых грамадскіх і культурных арганізацый. Яны таксама маглі б аказаць палёгку бібліятэкам. Прывядзём прыклад такой ініцыятывы. Пры Беларускім фондзе культуры створаны Савет садзейнічання бібліятэчнай справе, па ініцыятыве якога аб'яўлены штогодні конкурс «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры» з прысуджэннем грашовых прэмій тром бібліятэкам-пераможцам. Беларускі фонд культуры выдзеліў сродкі для набыцця старадрукаў для Дзяржаўнай бібліятэкі, перадае дары мастакоў новым бібліятэкам, праводзіць сумесна з імі мерапрыемствы.

Мы звяртаемся да прадпрымальнікаў, тых, хто працуе на дзяржаўных прадпрыемствах і асабліва да тых, хто ўжо ладзіць прыватны бізнес. Ведайце, нішто так не ўзвышае дзелавога чалавека як яго садружнасць з культураю, уклад сродкаў у яе развіццё.

Усім, хто хоча дапамагчы матэрыяльна нашым бібліятэкам, хто зацікаўлены ў нашым культурным нацыянальным адраджэнні, паведамляем — сродкі можна пералічваць на рахунак № 702301 у Гарадской дырэкцыі Мінскбізнесбанка, МФО 764 г. Мінска з адзнакай «Для бібліятэк».

Вельмі хочацца, каб наша кожная бібліятэка з'яўлялася не толькі месцам, дзе можна атрымаць інфармацыю па любому пытанню, але і асяродкам нацыянальнага адраджэння.

Няхай кожны з Вас дапаможа бібліятэкарам рэспублікі ажыццявіць такую ўдзячную задуму.

**САВЕТ САДЗЕЙНІЧАННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ БФК.**